# АСАБЛІВАСЦІ ПЕРАДАЧЫ І ЗБЕРАЖЭННЯ КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ І ТРАДЫЦЫЙ БЕЛАРУСІ КАНЦА 19 – ПАЧАТКУ 20 СТАГОДДЗЯ ( НА ПРЫКЛАДЗЕ ТКАЦТВА)

Дубовік А.Р.
Кафедра гуманітарных дысцыплін
Навуковы кіраўнік: Лютава В.У., к.г.н., дацент
e-mail: dubovik94@mail.ru

***Анатацыя*** **– Сення для Беларусі вельмі карысным можа быць папярэдні культурна –грамадскі вопыт у захаванні і развіцці народнага мастацтва. У гісторыі Беларусі некаторыя перыяды гістарычна –культурнага развіцця , якія мала закраналі даследчыкі, застаюцца “белымі плямамі”.Каб выкарыстаць у далейшым развіцці грамадства яго пленныя набыткі, трэба гэты вопыт ведаць і асэнсаваць з сучасных пазіцый.**

***Ключавыя словы: сацыяльна-культурная спадчына, нацыянальныя традыцыі, народнае мастацтва, тэхніка ткацтва***

У дадзенай працы ў гісторыка-мастацтвазнаўчым і культуралагічным аспектах разглядаецца сістэма грамадскіх адносін, што існавала ў галіне народнага мастацтва і промыслаў (на прыкладзе ткацтва) у Беларусі ў канцы 19 – пачатку 20 стагоддзя і ў перыяд 1921-1939гадоў на тэрыторыі Заходняй Беларусі падчас яе ўваходжання ў склад Рэчы Паспалітай.У даследванні рэканструявана тая сістэма, якая ў азначаныя перыяды дазваляла праз дзяржаўныя ўстановы, грамадска-культурныя абьяднанні, прыватныя ініцыятывы ўплываць на развіцце народнага мастацтва і промыслаў, уключаць іх у кантэкст агульнанацыянальнай культуры. У дедзенай працы закранута праблема захавання і развіцця мастацкіх традыцый на прыкладзе ткацтва, так як яно было найбольш распаўсюджаным сялянскім рамяством на Беларусі. Ткацтва захоўвалася нават там, дзе ў заняпадзе былі астатнія віды народных рамесніцкіх заняткаў. Ткацтва на Беларусі ў канцы 19 - пачатку 20 стагоддзя развівалася не толькі ў форме хатнягя рамяства, але і праз вучэбна-паказальныя майстэрні. Вучэбна-паказальныя майстэрні з аднаго боку садзейнічалі захаванню традыцыйных мастацкіх раместваў, а здругога боку –прыўнеслі ў традыцыю новыя тэхнікі, прыемы, узоры. Дзякуючы разнастаўнасці і багаццю арнаментыкі, каляровых спалучэнняў, ткацкіх перапляценняў народныя ўзорыстыя тканіны можна аднесці да галоўных дасягненняў і вяршынь беларускага народнага мастацтва.

Рэгіянальныя асаблівасці дэкаратыўна-ўжытовых рэчаў у дадзенай працы разгледжаны на прыкладзе старадаўняга артэфакта –ручніка- знойдзенага вучнямі гімназіі№7 г. Віцебска. Дадзены ручнік выкананы ў тэхніцы бранага і выбарнага ткацтва. Гэта вельмі каштоўная рэч, і адносіцца яна прыкладна да 1910 году. Выкананне ручніка вызначаецца тэхнічнай дасканаласцю і высокай якасцю. Усе гэта дазваляе меркаваць, што ен быў выкананы не ў хатніх умовах, а можа адносіцца да ткацкіх школ, якія дзейнічалі ў Себежскім і Бележскім паветах і паблізу Лезна. Ручнікоў гэтага тыпу захавалася вельмі мала, іх можна ўбачыць у Віцебскім абласным краязнаўчым музеі і Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі.



Мал. 1. Старадаўні артэфакт –ручнік

Вывучэнне дадзенага артэфакта падштурхнула да выканання практычнай часткі навуковай працы. Быў створаны камплект дэкаратыўных рэчаў(два ручнікі і тры падушкі), у якіх адлюстроўваецца нацыянальны каларыт. Для ручнікоў і падушак была выкарастана ільняная тканіна разрэджанай структуры. Пры распрацоўцы схем арнаменту выкарыстоўваліся ўзоры, сходныя з старадаўнім ручнікам. Вышыўка ручнікоў і дэкаратыўных падушак выканана ў тэхніцы нацяг, якая знешне вельмі падобна на тэхніку бранага ткацтва.

Асэнсаванне прыведзеных у даследаванні гістарычных фактаў, іх культуралагічны аналіз дае магчымасць больш поўна ўяўляць шляхі гістарычна-культурнага развіцця Беларусі, тое месца і ролю, якую ў ім адыгрывала народнае мастацтва і промыслы.

Для беларускай этнаграфіі і мастацтвазнаўчай навукі пытанне вывучэння этнічнага характару беларускага народнага мастацтва і традыцыйных раместваў і сення застаецца актуальным.

[1] Лабачэўская В.А. Зберагаючы самабытнасць: З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі. – Мн.: Беларуская навука, 1998.

[2] Бабровіч Г.А. Асаблівасці механізму збераждэння і трансляцыі культурных каштоўнасцей і традыцый шляхам развіцця прафесійнай адукацыі ў рэгіёне (на прыкладзе старасельскай прафесійнай ткацкай школы) / Навуковае выданне. Выяўленчае мастацтва ў сістэме адукацыі. – Віцебск, 2009.

[3] Лабачэўская В.А. Повязь часоў – беларускі ручнік. – Мн.:” Беларусь”,2002.